технологий. Информационные технологии позволяют не только качественно оформить сценарий и все печатное информационное обеспечение, но и сделать его более ярким, разнообразным и интересным.

1. Бахова, Н.А Конспект лекций по дисциплине «Арт-менеджмент», Красноярск, 2010 г.

2. Жилинская, Т.С. Медиакультура специалиста : учебн.-метод. пособие / Т.С. Жилинская. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2011. – 64 с.

3. Информационное обеспечение [Электронный ресурс] – режим доступа http://library_science.academic.ru – Дата доступа 13.03.2017

4. Искусство создания афиши [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://art.ioso.ru/wiki/index.php/Искусство_создания_плаката_и_афиши – Дата доступа 13.03.2017

5. Печать афиш [Электронный ресурс] – Режим доступа http://www.moscowbrand.ru/index.php?option=com_content&view=article&id=192&Itemid=219 – Дата доступа 13.03.2017

**Мухтарава М.А.,** студэнтка 414 гр.
Навуковы кіраўнік – Шалупенка Н.Я.

## ТРАДЫЦЫІ СЯМЕЙНАЙ АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Традыцыйная сямейная абраднасць беларусаў – неад'емная частка народнага быту, сямейнага ўкладу, духоўнай культуры народа, яго светапогляду, этыкі і эстэтыкі. Станаўленне і функцыяванне гэтай складанай культурна-гістарычнай з'явы абумоўлены заканамернасцямі сацыяльна-гістарычнага развіцця і этнічнымі традыцыямі беларускага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народа. Сямейныя звычаі і абрады аб'ядноўвалі і ўмацоўвалі сям'ю, служылі своеасаблівым механізмам перадачы традыцый, маральна-этычных норм і прынцыпаў ад старэйшых да малодшых. Яны дапамагалі кожнай канкрэтнай сям'і з годнасцю адзначыць такія важныя падзеі, як нараджэнне дзіцяці, ўступленне маладых у шлюб, пераход сям'і ў новую хату, або зняць эмацыянальна-псіхічнае напружанне ў выпадку смерці каго-небудзь з блізкіх.

Традыцыйная сямейная абраднасць беларусаў прадугледжвала звычаі і абрадавыя дзеянні, якія ўмацоўвалі «знешнія» сувязі сям'і з суседзямі, сваякамі, сябрамі, дапамагалі ўсталяванню добразычлівых адносін паміж імі, а таксама фарміравалі прэстыж сям'і сярод аднавяскоўцаў. Веданне і выкананне сямейных звычаяў і абрадаў адыгрывалі немалаважную ролю у фармаванні пэўнай станоўчай ці адмоўнай грамадскай думкі аб той ці іншай сям'і. Акрамя таго, ў народзе бытавала ўяўленне, што выкананне пэўных абрадавых дзеянняў можа станоўча паўплываць на лёс дзіцяці ці маладой шлюбнай пары, забяспечыць дабрабыт, багацце і здароў‘е сям'і.

У сямейнай абраднасці беларусаў значнае месца займаюць вясельныя звычаі і абрады, у якіх знайшлі адлюстраванне формы сям'і і шлюбу, маральныя каштоўнасці і ідэалы, а таксама даўнія кантакты з суседнімі народамі, што праявілася ў наяўнасці розначасовых па паходжанні элементаў вясельнай абраднасці. Акрамя таго, для вясельнай абраднасці беларусаў характэрна своеасаблівая варыятыўнасць, якая ў значнай ступені залежыла ад традыцый той ці іншай беларускай вёскі.

Адпраўной кропкай у развіцці вясельнай абраднасці з'яўляецца сватаўства. Некалі яно мела вельмі важнае грамадскае значэнне, таму што шмат у чым прадвызначала не толькі шлюбны звяз маладой пары, але і наступны характар адносін паміж двума родамі. Сватаўство — гэта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзважаны і прадуманы крок першым чынам з боку бацькоў жаніха. Таму да яго ставіліся з усёй адказнасцю, старанна выбіраючы час візіту і тых людзей, якія ў ім будуць браць удзел. Па ўяўленнях нашых продкаў, самым спрыяльным днём для сватаўства лічыўся чацвер. Але часта сватанне таксама адбывалася і ў аўторак, і ў суботу. Ключавой постаццю ў падзеях і абрадах перадвясельнага перыяду, а таксама ў рытуале самога вяселля з'яўляўся сват, які, як правіла, быў хросным бацькам жаніха. Калі ж, па якіх-небудзь прычынах, яго не было ці яго статус не адпавядаў правядзенню абраду сватаўства (аўдавеў, быў разведзены, жаніўся ў другі раз), то свата выбіралі з ліку мужчын, старэйшых за 40 гадоў, які меў сям'ю і дзяцей, а таксама аўтарытэт, быў здольны кіраваць ходам падзей. Звычайна сват адпраўляўся «на заручыны» з боханам хлеба і бутэлькай гарэлкі. Сватаўство лічылася паспяховым, калі ў канцы застолля маці будучай нявесты выконвала глыбока сімвалічны рытуал: у бутэльку, прынесеную сватам, яна насыпала збожжа жыта, загортвала ў ручнік і вяртала госцю, што азначала: «Пасеянае збожжа абавязкова прарасце новым коласам». На Віцебшчыне перад тым, як ісці ў сваты, клалі на ноч на двары кавалак хлеба: калі хлеб быў цэлы – гэта прадвяшчала ўдалае сватанне, калі яго пагрызлі мышы – лепей адкласці і не ісці [1, с. 232].

У дзень вяселля госці жаніха і нявесты збіраліся асобна ў жаніха і нявесты. Шаферкі апранілі нявесту ў вясельнае адзенне (вянок на галову, фату і г. д.). Нявесту садзілі разам жаніхом на ўпрыгожаныя калёсы - у каней на шыі былі звонкія бубянцы, якія далёка былі чутны, калі ехала вяселле. На шляху язды вяселлю перагароджвалі дарогу, каб лепш разглядзець нявесту і патрабаваць выкуп ад жаніха. Нявесту бацькі жаніха сустракалі перад сваім домам з хлебам і соллю. Пасля чаго запрашалі ўсіх гасцей збоку нявесты і жаніха за стол, дзе працягвалася вяселле з песнямі і гульнямі [2, с. 24].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

За столом на куцце садзілі нявесту каля яе шаферак, кросных бацькоў, маці і ўсіх родзічаў. Каб замужам быў дастатак нявесту садзілі на кажух, паравернуты ўверх поўсцю. Бацькі нявесты ставілі на стол перад ёй посуд з падарункамі, пасля чаго ўсе госці клалі падарункі ад сябе. Гасцей збоку жаніха абавязкова абвязвалі вышытымі ручнікамі бацькі нявесты, а збоку нявесты – бацькі жаніха.

Каб маладыя былі пладавітыя і багатыя, на вяселлі іх пасыпалі зернем, кадкі з зернем ставілі ў хату, дзе жаніх з нявестаю правадзілі першую шлюбную ноч. [1, с. 245]. Адным з асноўных вясельных атрыбутаў з‘яўляўся каравай. Яго трохузроўневая кампазіцыя сімвалізавала міфапаэтычную мадэль свету або радаводную сувязь. «Ніжняя шырокая частка – сімвал роду, які спраўляў вяселле, сярэдняя частка сімвалізавала сям‘ю, у якой нарадзіўся жаніх ці нявеста, верхняя частка – пара галубкоў, «шышачкі», «звяркі» – гэта доля маладых, якую трэба было непадзельна захоўваць усё жыццё». У Жабінкаўскім раёне пяклі каравай у час вяселля. Гэта быў вялікі бохан, які ўпрыгожвалі рагальчыкамі, абвешанымі папяровымі кветкамі, цукеркамі, пернікамі, часам невялікімі яблыкамі. Гэткая аздоба называлася «садам», і пры падзеле каравая яго выкуплялі. Спецыяльным упрыгожваннем вясельнага печыва ў Іванаўскім раёне з‘яўляюцца «шышкі», якімі называюць галінкі вішні на каравai нявесты і галінкі грушы на каравai жаніха. Галінкі павінны быць з тых дрэў, што пладаносяць. Пружанскія каравайніцы ў якасці галоўнага ўпрыгожвання выкарыстоўвалі ружу, «каб доля цвіла, як гэта кветка» [3, с. 228].

У канцы вяселля, пасля таго як дзяўчына-нявеста набудзе статус жанчыны-гаспадыні, да яе падыходзіла маці жаніха, здымала фату і вянок – сімвал непарушнасці, цнатлівасці – і павязвала два атрыбуты жаночай долі: хусцінку і фартушок.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Радзінныя абрадавыя традыцыі беларусаў складваліся ў глыбокай старажытнасці і ўдасканальваліся на розных этапах развіцця беларускага грамадства. Да найбольш важных падзей радзіннай абраднасці беларусаў адносіцца абрад першага купання дзіцяці. Пры першым купанні дзіця ляжала тварам на захад ці поўнач, а ў ваду клалі якія-небудзь прадметы. На Віцеб-шчыне падчас першага купання дзіцяці ў ваду клалі «зерне, грошы, бурштын ці трошкі сала; на Магілёўшчыне «сыпалі мак, клалі лустачку хлеба, ваду перахрэшчвалі тры разы; на Гродзеншчыне «бабка кідала ў ваду трохі солі, каб абараніць ад злога вока, ды попелу як аднаго з магічных сродкаў далучэння дзіцяці да хатнягя ачага» [4, с. 56-57]. Ваду пасля купання вылівалі пад дрэўца, якое саджалі бацькі нованароджанага ў гонар з‘яўлення немаўляці на свет. Калі нараджалася дзяўчынка, ваду вылівалі пад вішню або яблыню (каб была прыгожай, здаровай, нарадзіла многа дзяцей), пасля купання хлопчыка – пад ясень, топаль, дубок (каб таксама быў здаровы, прыгожы, дужы, доўга жыў).

Існавала павер'е: калі дзіцяце пасля першага купання пакласці на правы бок, то яно ў далейшым жыцці будзе ўсё рабіць правай рукой і наадварот. Існавала сістэма варожбаў аб будучым лёсе дзіцяці ў залежнасці ад яго дня нараджэння: панядзелак – родзіцца няўмека, аўторак – нараджаюцца працавітыя людзі, серада – неакрэслены лёс, чацверг - будзе шанцаваць, але хуткая смерць, пятніца – лайдак, злодзей, субота – шчаслівымі, удачлівамі, нядзеля – самыя шчаслівыя людзі, якіх чакае шанцаванне і поспех [5, с. 154].

Хрэсбіны імкнуліся адсвяткаваць ў дзень царкоўнага хрышчэння. Без запрашэння на гэтую ўрачыстасць ніхто не прыходзіў. Усе жанчыны, што ішлі на хрэсбіны неслі з сабой прадукты.

Спецыяльнай абрадавай стравай на хрэсбінах з'яўлялася бабіна каша, якую гатавала павітуха, або хросная бабка. Для гэтай стравы куплялі новы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гаршок, які потым разбівалі. У час падзелу кашы, якая амаль заўсёды заставалася за кумам, прыходзіў бусел, які віншаваў бацькоў і прыносіў ляльку (калыску). На хрэсбінах заўсёды прысутнічалі песні, якія былі пранізаны малітвамі за лепшую долю дзіцяці. Бабіну кашу хутка з'ядалі, каб дзіця пачало хутчэй гаварыць і хадзіць. Вялікае значэнне меў абмен падарункамі паміж парадзіхай і кумамі і бабкай-павітухай. Як правіла парадзісе даравалі ручнік, абрус, хустку. Для бабкі і кумоў наміткі. Затым бабка рабіла магічныя дзеянні, каб лёс дзіця быў шчаслівы, пасля якіх быў рытуальны танец [5, с. 157].

Сямейная абраднасць у пэўнай ступені захоўваецца ў сучасным беларускім грамадстве. Безумоўна, нельга ставіць знак роўнасці паміж тымі абрадамі, што зафіксаваныя этнографамі ў XIX ст. і тымі, сведкамі якія мы можам бачыць на напачатку XXI ст. Сямейныя абрады ў значнай ступені падвергліся трансфармацыі, страцілі многія традыцыйныя элементы і набылі новыя. Разам з тым і сёння захоўваюцца ключавыя кампаненты, непасрэдна звязаныя з асаблівасцямі традыцыйнага светапогляду беларусаў.

1. Беларусы: у 9 т. Т.5: Сям‘я / В.К. Бандарчык, Г.М. Курыловіч Т.І. Кухаронак; пад рэд. В.К. Бандарчыка [і інш.]. – Мінск : Бел. навука, 2001. – 375 с.

2. Гуд, П.А. Народныя традыцыі ў сучасных беларускіх святах / П.А.Гуд // Пазашкольнае выхаванне. – 2002. – №2. – С.23-26

3. Котович, О.В., Крук, И.И. Золотые правила народной культуры /О.В. Котович, И.И. Крук. — Мн. : Адукацыя і выхаванне, 2010. — 592 с.

4. Кухаронак, Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: Канец XIX–XX ст. / Т.І. Кухаронак. – Мн. : Навука і тэхніка, 1993. – 126с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Сям‘я і сямейны быт беларусаў / Пад рэд. В.К. Бандарчыка [і інш.]. пад агульн. рэд. В.К. Бандарчыка – Мн. : Навука і тэхніка, 1990. – 256 с.

**Николаева К.А.,** студент 301а гр.

Научный руководитель – Белокурская Ж.Е.

## ЖЕНСКИЙ ОБРАЗ В ТЕЛЕРЕКЛАМЕ

В современном мире существует множество техник влияния на выбор потребителя с помощью разнообразных средств коммуникации. Самым распространённым и доступным среди них является телевизионная (ТВ) реклама. Следует отметить, что реклама на ТВ не единственный способ рекламирования и манипулирования сознанием потребителей. Успешно применяется скрытая реклама в кинофильмах, а определённые установки в сознании человека способны сформировать выпуски новостей и телешоу. Способы рекламодателей создать потенциально возможный образ окружающей действительности через эксплуатацию женской темы вынуждает их заимствовать образцы социального поведения из репертуара повседневной жизни. Поэтому в поисках материалов для рекламных предложений рекламодатели обращаются к ежедневным ритуалам повседневности, а лучшей моделью для заимствования служит тот аспект социального поведения, который легко распознается в рекламных объявлениях, интерпретируется с первого взгляда и в то же время проникает в самую суть определения человеческого существа, то есть гендерные характеристики и отношения [2]. В основу содержательной

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ